*С. М. Якуба (Рэспубліка Беларусь, Мінск,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*

# ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ Ў СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Пры навучанні беларускай мове актуальным з'яўляецца вызначэнне ступені сфарміраванасці ў вучняў той ці іншай кампетэнцыі. У сувязі з тым, што працэс развіцця кампетэнцый уяўляецца як бесперапынны, то пра ступень сфарміраванасці той ці іншай з іх можна гаварыць толькі як пра ўзровень валодання мовай на пэўным этапе навучання. Прычым узровень валодання мовай вызначаецца ступенню сфарміраванасці моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, рытарычнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый, якія забяспечваюць магчымасць камунікаваць на беларускай мове з выкарыстаннем неабходных уменняў і навыкаў.

Адзначаючы ролю дыягностыкі працэсу навучання, варта падкрэсліць, што яна "дае магчымасць на ўсіх яго этапах ажыццяўляць кантроль дасягнення навучэнцамі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў у працэсе навучання беларускай мове, што адпавядае сучасным патрабаванням дзяржавы, грамадства ў падрыхтоўцы навучэнцаў да жыцця і прафесійнай дзейнасці" [1, с. 87]. Дыягностыка ажыццяўляецца на матэрыяле заданняў, распрацаваных на аснове тэкстаў розных стыляў, тыпаў і жанраў, у большасці выпадкаў аб’яднаных тэматычна. З улікам неабходнасці праверыць чытацкую пісьменнасць для аналізу прапануюцца не толькі ўрыўкі з мастацкіх і публіцыстычных твораў беларускіх пісьменнікаў, але і тэксты з розных камунікатыўных сітуацый чытання: прыватныя і афіцыйныя лісты, СМС, афіцыйныя дакументы, інструкцыі, звесткі пра грамадскія і гістрычныя падзеі, інфармацыя з інтэрнэта, дапаможнікаў, энцыклапедый і інш. Такі падыход дазваляе вызначыць, ці могуць вучні параўнаць і супаставіць думкі і меркаванні розных аўтараў адносна акрэсленай праблемы, вызначыць асаблівасці моўных і моўна-выяўленчых сродкаў, выкарыстаных аўтарамі тэкстаў для рэалізацыі пастаўленай задачы, выказаць уласнае меркаванне па закранутых пытаннях, аналізаваць, рабіць вывады і абагульненні на аснове інфармацыі з розных крыніц, ствараць уласныя тэксты пэўнага стылю, тыпу і жанру на прапанаваную тэму ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай і прагматычнай устаноўкай.

У цэлым кампетэнтасна арыентаваныя дыягнастычныя матэрыялы варта разглядаць як комплексную працу з тэкстам, якая пададзена сістэмай тэарэтычных пытанняў і практычных заданняў, накіраваных на вызначэнне ступені засваення пэўнага вучэбнага матэрыялу (тэмы, раздзела і інш.), засвоенага за акрэслены тэрмін навучання (чвэрць, навучальны год і г.д.).

Пры падрыхтоўцы пытанняў і заданняў адбіраецца матэрыял, які складае асноўную тэарэтычную частку вывучанай тэмы (раздзела); фактычны матэрыял, найбольш важны ў адукацыйным, пазнавальным, развіццёвым і выхаваўчым аспектах; практычныя заданні, што дазволяць меркаваць пра сфарміраванасць прадметных кампетэнцый; заданні і пытанні, якія патрабуюць ад вучняў умення самастойна працаваць.

Праверыць ступень сфарміраванасці моўнай і маўленчай кампетэнцыі дапамогуць заданні на засваенне паняцця пра тэкст, моўных і маўленчых адзінак і паняццяў, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў ў маўленні, на развіццё розных відаў маўленчай дзейнасці і засваенне моўных норм.

Значнае месца ў сістэме дыягнастычных матэрыялаў адводзіцца практыкаванням рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага характару, на аснове якіх вызначаецца ўзровень сфарміраванасці камунікатыўнай і рытарычнай кампетэнцыі. Да іх адносяцца пераклад з рускай мовы на беларускую, пераказ тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў, сачыненне на прапанаваную тэму на аснове прачытаных крыніц, апісанне помніка на матэрыяле інтэрнэт-крыніц, напісанне нататак у газету, прыватных і афіцыйных лістоў, падрыхтоўка тэкстаў запрашэння, прамовы, пытанняў для інтэрв’ю і інш.

Дыягностыка лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцыі ажыццяўляецца на матэрыяле тэкстаў адпаведнай тэматыкі, а таксама пры выкананні заданняў на выяўленне, характарыстыку і выкарыстанне нацыянальна маркіраваных моўных адзінак розных узроўняў, сімвалаў беларускай культуры, ветлівых зваротаў і выразаў, усведамленне нацыянальнай культуры ў кантэксце сусветнай і інш. У кампетэнтнасна арыентаваных дыягнастычных матэрыялах прапануюцца заданні на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі вучня, яго нацыянальную самаідэнтыфікацыю, выяўленне прафесійнай траекторыі асобы, паважлівага стаўлення да маральна-духоўных і сямейных каштоўнасцей.

Дыягнастыяныя матэрыялы дазваляюць ажыццяўляць навучальнае і кантрольнае тэсціраванне вучняў на аснове заданняў закрытага (з выбарам аднаго або некалькіх правільных адказаў з шэрагу прапанаваных) і адкрытага тыпу (самастойны адказ на пытанне без магчымасці выбару з некалькіх варыянтаў). Перавага аддаецца заданням адкрытага тыпу, бо якраз яны дазваляюць прасачыць здольнасць вучняў вырашаць пастаўленыя вучэбныя задачы шляхам выбару найбольш камунікатыўна мэтазгодных моўных сродкаў, знаходзіць аптымальнае рашэнне праблемнай маўленчай сітуацыі, уменне класіфікаваць, аналізаваць, сістэматызаваць, абагульняць матэрыял, вусна і пісьмова абгрунтоўваць уласную думку.

Кампетэнтнасна арыентаваныя дыягнастычныя матэрыялы ў сістэме падрыхтоўкі вучня могуць служыць і сродкам кантролю, і сродкам дыягностыкі цяжкасцей у авалоданні моўным матэрыялам, і сродкам прагназавання паспяховасці навучання. Варта падкрэсліць, што прапанаваныя заданні дазволяць вучням самастойна праверыць ступень авалодання ведамі, уменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці.

Шырокія магчымасці ў рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу дае праца на аснове твораў класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Разгледзім сістэму заданняў, што прапануюцца для дыягностыкі па тэме "Агульныя звесткі пра мову. Стылістыка" (11 клас).

1. Прачытайце тэксты. Вызначце, да якіх стыляў яны адносяцца.

I. Слова – радасць, слова – чары,
Вобраз вечна юных вёсен!
Ёсць ты ўсюды: у сонцы, у хмары,
Ты глядзіш праз неба просінь.
Лашчыш слых мой, слова-ззянне,
Атуляеш сэрца ласкай.
Ноч і вечар, дзень, світанне
Абняло ты, слова-краска! (Я. Колас).

II. Верш Якуба Коласа падобны да прахалоднай р..чной плыні звонкі дасканалы напеўны по..ны чараў. Верш (зварот) да сам..га Слова, панегірык гэтаму слову размова са Словам сам(насам). Спакойная ўпэўнен..асць дасканаласці ра..квечаныя (н..)сціханай любо..ю жывыя вершаваныя ра..кі туга пер..плеценыя перавітыя а..мысловым рытмам падобным да біц..я с..рца. Рыфмы наніз..ваюцца адна на адну па..парадкоўваючыся ўладнай волі творцы рыфмы чару..ць вып..ваюць патаемныя чары – ад самой гэтай зямлі.

Сёння, як і пяцьдзясят, і сто гадоў таму, і заўжды нязменна важнае Слова. Сваё, адзінае, роднае Слова, уласная музыка – у свеце, поўным чужароднага шуму. Важна прайсці шлях да Слова, знайсці яго ўнутры ўласнай душы, і там – выспеліць, узгадаваць, захаваць (М. Латышкевіч).

III. Слова – не рэальны прадмет, яго не ўзважыш, каб дакладна ацаніць яго і правільна азначыць. Тут мы маем справу з густам, з пачуццём мовы, з эстэтычнай ацэнкай, а гэтыя катэгорыі не маюць акрэсленых правіл і сталых норм. Усё гэта змушае нас вельмі ўважна і дбайна ставіцца ў дачыненні да мастацкага слова. *Слова для пісьменніка – гэта асноўная канва, на якой будуе ён сваю мастацкую творчасць*. І не толькі паасобнае слова, як такое, павінна стаяць у цэнтры ўвагі пісьменніка: ён павінен адводзіць максімум увагі і спалучэнню слоў як у сказах, так і ў агульным плане ўсіх элементаў, з якіх складаецца мастацкі твор: апісанне, дыялогі, абрысоўка характараў, падача сцэн і г.д. (Я. Колас).

1. Вызначце, ці існуе сувязь паміж трыма прачытанымі вамі тэкстамі. Адзначце *Так* ці *Не* для кожнага сцвярджэння.

| | | |
|---|---|---|
| Тэкст пад нумарам III тэматычна не суадносіцца з папярэднімі двума тэкстамі. | Так | Не |
| Усе тры тэксты аб'яднаны агульнай тэмай ролі і месца беларускай мовы ў жыцці народа. | Так | Не |
| У тэкстах асвятляюцца розныя пытанні, таму іх нельга аб'яднаць адной тэмай. | Так | Не |

3. Вызначце: да якога тыпу маўлення (маналагічнага ці дыялагічнага) адносяцца тэксты? Абгрунтуйце сваю думку.

4. Адзначце асноўныя сродкі мовы, характэрныя для публіцыстычнага стылю:

а) словы з адценнем эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці;

б) стандартныя канцылярскія выразы і звароты;

в) рытарычныя пытанні, воклічы;

г) кніжныя словы, тэрміны;

д) словы грамадзянска-палітычнага зместу.

5. З чым параўноўвае Якуб Колас слова ў вершы? Ці можна лічыць, што ў тэксце лексема *слова* выступае як мнагазначная?

6. Якую ролю адыгрываюць у тэксце назоўнікі? Назавіце ключавыя словы-назоўнікі, якія дапамаглі б вам перадаць змест тэксту. Запішыце назоўнікі *слых, сэрца, ласка* ў форме меснага склону адзіночнага ліку.

7. Выпішыце з верша сказ са звароткам. Абгрунтуйце свой выбар.

8. Спішыце першы абзац другога тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце напісанне арфаграм і пастаноўку пунктаграм.

9. Якім перад аўтарам другога тэксту паўстае верш Якуба Коласа "Слова – радасць, слова – чары"? Ці з'яўляюцца раўнацэннымі для аўтара лексемы *Слова* і *мова*? Як можна прайсці шлях да Слова?

10. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

11. Назавіце значэнне, якое адпавядае слову *панегірык*.

А. Урачыстая песня, прынятая як сімвал дзяржаўнага адзінства.

Б. Празмерна хвалебны водзыў аб кім-, чым-небудзь.

В. Твор павучальнага характару.

12. Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана форма дзеяслова, ад якой утвораны дзеепрыметнік:

а) *пераплецены – пераплесці;*

б) *перавіты – віць;*

в) *адліты – адліць;*

г) *расквечаны – расквеціць.*

13. З чым параўноўвае Якуб Колас слова ў трэцім тэксце? Чаму не толькі слова павінна стаяць у цэнтры ўвагі пісьменніка?

14. Устанавіце адпаведнасць паміж аднароднымі членамі сказа і іх сінтаксічнай роляй.

| | |
|---|---|
| Усё гэта змушае нас вельмі ўважна і дбайна ставіцца ў дачыненні да мастацкага слова. | дапаўненне |
| Слова – не рэальны прадмет, яго не ўзважыш, каб рэальна ацаніць яго і правільна азначыць. | акалічнасць |
| Тут мы маем справу з густам, з пачуццём мовы, з эстэтычнай ацэнкай… | выказнік |

15. Звярніцеся да інтэрнэт-рэсурсаў і прачытайце інфармацыю пра флэшмоб бесперапыннага чытання паэмы Якуба Коласа "Новая зямля", прымеркаваны да 140-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Які ўрывак з твора вы выбралі б для чытання? Напішыце заяўку на ўдзел у акцыі і падрыхтуйце відэаматэрыял.

Такім чынам, кампетэнтнасна арыентаваныя дыягнастычныя матэрыялы накіраваны не толькі на праверку лінгвістычных ведаў, а і на выяўленне ступені сфарміраванасці маўленчых паводзін, што непасрэдна звязана як з веданнем самой мовы, так і з псіхалогіяй, прагматыкай, сацыялогіяй. Рэалізацыі гэтай мэты дапамае праца на аснове творчай спадчыны беларускіх класікаў, што прасякнута надзённай жыццёвай філасофіяй, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, з’яўляецца ўзорам багацця, вобразнасці і выразнасці маўлення.

### ***Літаратура***

1. Валочка, Г. М. Беларуская мова 10 клас. Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы (базавы і павышаны ўзроўні): дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. М. Якуба. – Мазыр : Выснова, 2021.